***В.С. Варапаева,** прафесар*

# КРЫТЭРЫІ АДБОРУ КНІГ ДЛЯ ЧЫТАННЯ ДЗЕЦЯМ

Чытанне – адзін з магутных фактараў фарміравання асобы. Яно ўздзейнічае не на некаторыя бакі псіхікі чалавека, а на асобу, індывідуальнасць у цэлым. Менавіта літаратура фарміруе ў чытача глыбокія ўяўленні аб жыцці і дзейнасці чалавека, дапамагае авалодаць багаццямі роднай мовы, яе камунікатыўнымі і выяўленчымі сродкамі, дае магчымасць выкарыстоўваць чытанне як інструмент пазнання і зносін. Нарэшце, літаратура дае прыклады для пераймання. Але патэнцыяльныя магчымасці кнігі выяўляюцца толькі тады, калі яе чытаюць. Між тым, як сведчаць псіхолагі, педагогі, бібліятэкары, прэстыж чытання з кожным годам падае. У цяперашні час востра стаіць праблема: што чытаць дзецям і моладзі? Якія кнігі варта прапанаваць у першую чаргу? Пра што і як пісаць пісьменнікам? Гэта праблема не толькі наша, але і сусветная. Амерыканка К.Фон Найт (г. Грэйсан) разважае над тым, што такое добрая кніга. Гэта тая, якая захапляе, якая падабаецца дзецям. Добрая кніга – гэта займальны сюжэт, які ўключае і пераадоленне цяжкасцей, і прыгоды, і (пасля столькіх хваляванняў!) шчаслівы канец, які выклікае ў дзіцяці аблягчэнне, а таксама веру ў дабро, справядлівасць, у тое, што дабро ўсё ж такі перамагае зло. Добрая кніга – гэта і героі, якія на час чытання становяцца для дзяцей сябрамі. Часта зачараванне кнігай выклікана і стылем, і мелодыяй аўтарскай мовы, якая пераўтварае чытанне ў вялізнае задавальненне. Дзіця, якому ніколі не даводзілася, утульна ўладкаваўшыся ў крэсле, затаіўшы дыханне, чакаць пачатку гісторыі, такое дзіця пазбаўлена адной з самых вялікіх радасцей у жыцці. Але добрай гісторыі мала быць захапляльнай. Добрая кніга павінна развіваць лексікон дзяцей. Адным з выразных сродкаў вялікіх майстроў сусветнай літаратуры з’яўляецца мова. Багацце мовы, яе сіла, праўдзівасць і дакладнасць адпавядаюць важнейшай ролі мовы, пра якую сведчыць Біблія. У першым і другім раздзелах Быцця (у аповедзе пра стварэнне свету) сказана, што Бог словам Сваім стварыў усё існае: “Спачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог”. Мова, як і творчае ўяўленне, – дар Божы. Вось чаму мы павінны прапаноўваць дзецям кнігі, напісаныя дакладнай, ідэальнай мовай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але кніга павінна развіваць не толькі лексікон, розум і інтэлект. Кніга – магутны выток маралі. У казках, міфах, прымаўках закранаюцца пытанні ўзаемаадносін у грамадстве, маральнага выбару ў складанай сітуацыі. Добрая дзіцячая кніга павінна быць такой, каб апісваемыя ў ёй жыццёва важныя пытанні кранулі сэрца дзіцяці.

Добрыя кнігі павінны, па-першае, захапляць дзяцей, па-другое, пашыраць іх кругагляд, па-трэцяе, у метафарычнай форме і на даступным узроўні прапанаваць самыя важныя пытанні, з якімі дзецям давядзецца сустрэцца ў жыцці. Але якімі важнымі ні былі б гэтыя якасці, галоўнае: у кнігах для дзяцей павінна быць надзея. Многія казкі народаў свету і літаратурныя творы нясуць дзецям вестку, поўную надзеі. Героі ў іх пасля цяжкіх выпрабаванняў ("Міо, мой Міо" А.Ліндгрэн, "Властелин колец" Толкіена, "Хроники Нарнии" Клайва Льюіса і інш.) заўсёды застаюцца жывымі і знаходзяць шчасце, а гэта сведчыць пра тое, што няма сітуацый, з якіх нельга знайсці выйсце, чытачы змогуць пераадолець перашкоды, якія сустрэнуцца на іх шляху. Нельга пісаць і прапагандаваць дзецям кнігі, у якіх няма надзеі на лепшае. Не абавязкова, каб усе кнігі мелі шчаслівы канец. Са знакамітай казачнай эпапеі "Хроники Нарнии", напісанай вялікім Клайвам Стэйплзам Льюісам, дзеці даведаюцца, што боль і смерць – гэта рэальнасць, што леў Аслан – персанаж, у якім лёгка пазнаць Ісуса, можа выклікаць жах, таму што яго цяжка пераканаць. Але Ён ёсць таксама і Любоў, і з кожным паходам у выдуманую краіну Нарнію дзеці – героі кнігі – і дзеці – яе чытачы – усё больш даведваюцца пра Бога. Мы можам не турбавацца пра тое, што будуць чытаць нашы дзеці, калі прапануем ім кнігі, якія вядуць да разумення сэнсу жыцця і ролі ў ім Бога.

Зусім нядаўна трапіла ў рукі цудоўная кніга Юрыя Юр'евіча Парынца "Книги, которые читают наши дети, и книги, которые им читать не следует" [2]. Аўтар расказвае пра казкі і казачнікаў (пачынаючы з XVII ст. і да нашых дзён) з пункту гледжання веруючага чалавека, праваслаўнага вучонага. У кнізе раскрываюцца таямнічыя глыбіні творчасці казачнікаў. І мы пачынаем адрозніваць нябачную духоўную небяспеку, варожыя настроі, бачыць, дзе сапраўдны свет, сцвярджаецца праўда, прыадчыняецца шлях да ісціны. Мы даведваемся аб рэлігійнасці казак А.С.Пушкіна, духоўных алегорыях у творах Толкіена, хрысціянскіх ідэалах у казках Андэрсена, пра духоўныя пошукі Сент-Экзюперы і іншых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

казачнікаў, перад намі зусім па-іншаму паўстаюць і Русалачка, і Снежная Каралева, і Маленькі прынц. Гэта кніга паказвае нам тыя дарогі, па якіх мы зможам весці дзяцей да свету і веры, да чысціні і любові.

Нам падаецца, камплектаванне бібліятэк творамі, рэкамендацыя іх дзецям, падлеткам павінна быць надзвычай выбарачнай. “Лучше ничего не читать, чем читать дурно выбранные книги”, – пісаў у свой час В.Р.Бялінскі [1]. І сапраўды, калі чытаць “дурно выбранные” творы, то сапсуеш густ і сваё ўнутранае “я”. Кнігі павінны несці радасць, адчуванне свету і дабра, у іх не месца жахам, жорсткасці. Звернемся, напрыклад, да казак, якія традыцыйна лічацца самымі запатрабаванымі сярод дашкольнікаў, малодшых школьнікаў і падлеткаў. Тут назіраецца цікавая тэндэнцыя: многія дзеці перастаюць любіць гэты жанр. Чаму? Можа сапраўды таму, што ў большасці сваёй яны жорсткія (амаль усе казкі Ш.Перо, Гаўфа, Гофмана, братоў Грым і асабліва сучасныя, такія як аповесць-казка Джоўн Роўлінг пра Гары Потэра). Кнігі Роўлінг аб’яўлены ва ўсім свеце літаратурнымі шэдэўрамі. Але на самай справе гэта не зусім так. У мастацкім сэнсе гэта творы даволі блёклыя, героі – схемы, псіхалогія іх не распрацавана. У казках Роўлінг шмат жудасных сцэн. Хутчэй за ўсё, што на ўражлівых дзяцей яны могуць аказаць надзвычай моцнае ўздзеянне (начныя страхі, энурэзы, псіхічная няўстойлівасць). Надзвычай выразна паказаны моц і эфектыўнасць закляццяў, рэальнасць магіі, як белай, так і чорнай, што робіць творы Роўлінг небяспечнымі для юных чытачоў, бо незалежна ад жадання аўтара сіла зла выглядае прывабнай.

Але сярод класічных і сучасных казак ёсць унікальныя творы, напоўненыя светам і дабрынёй. Гэта казкі А.С.Пушкіна, А.Пагарэльскага, П.Яршова, Г.Х.Андэрсена, С.Тапеліуса, Туве Янсан, Ш.Сільверстайна, Д.Чыярдзі, Астрыд Ліндгрэн і беларускіх аўтараў: В.Віткі, П.Місько, Г.Аўласенкі, А.Масла, Л.Рублеўскай і інш. Беларускія казачнікі ведаюць псіхалогію дзяцей, іх імкненні да таямнічага, незвычайнага, у іх творах няма жорсткасці, яны прапагандуюць здаровы лад жыцця, разумны сэнс. У ліку іх казкі Л.Рублеўскай (“Карона на дне віра”, “Казкі з хутара Юстыны”, “Апошняя песня скрыпкі” або “Валяр’ян духмяны” і інш.). Скразной тэмай яе казак з’яўляецца тэма мастака і роднай зямлі. Кожная з казак у жанравых адносінах уяўляе міфалагізаваную прозу (цалкам мажлівыя карціны і падзеі, пададзеныя рамантычна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта значыць без канкрэтызацыі месца дзеяння, у іх выкарыстаны фальклорна-міфалагічныя элементы: вераванні, праклёны і інш.). Казкі Л.Рублеўскай нясуць багатую пазнавальную інфармацыю пра мінулае, прыродны свет Беларусі, маюць вялікі выхаваўчы патэнцыял. Надзвычай цікавымі з'яўляюцца рытмізаваныя казкі П.Місько і Г.Аўласенкі. Варта адзначыць іх цудоўную беларускую мову. Творы Г.Аўласенкі "Сказ пра Мураша-лайдака", П.Місько "Прыйдзі, дзень-залацень, або Казкі дзеда Аўласкі і бабкі Параскі" паказваюць спрадвечную мару чалавека пра светлую будучыню. І падаецца гэта ўсё лёгка, іскрыста, з гумарам і надзеяй на лепшае.

Цікава, змястоўна, пазнавальна – так гавораць дзеці пра казкі А.Масла. Пажадана каб жанр казкі не стаў адзіным у творчасці несумненна таленавітай аўтаркі.

У XX–XXI стст. жанр літаратурнай казкі развіваецца ў некалькіх напрамках. Назіраюцца тэндэнцыя адыходу ад фальклорнага матэрыялу, а таксама ўзмацненне аўтарскага пачатку. Моцнае развіццё атрымалі вершаваныя казкі (Л.Дранько-Майсюк "Цацачная крама", Р.Барадулін "Казкі і небылічкі для Дамінічкі"), ускладняецца сюжэт аўтарскіх казак, павялічваецца іх памер. У некаторых казках некалькі сюжэтных ліній, мноства другарадных і эпізадычных персанажаў. З'яўленне фэнтэзі – адзін з папулярных у наш час літаратурных напрамкаў (Р.Баравікова "Казкі астранаўтаў", "Галенчыны Я", Л.Бяссон "Артур і мініпуты" і інш.).

Даволі плённа развіваюцца ў сучаснай літаратуры фантастычны, прыгодніцкі жанры, паэзія, драматургія. Неабходна прадуманая работа і крытыкаў, і бібліятэкараў, і педагогаў, і бацькоў па давядзенні цікавых твораў да чытачоў.


1. *Белинский, В.Г.* О детской литературе / В.Г.Белинский. – М.: Детская литература, 1983. – С. 70–105.

2. *Парынец, Ю.Ю.* Книги, которые читают наши дети, и книги, которые им читать не следует / Ю.Ю.Парынец. – СПб.: Сатис Держава, 2004.

3. *Полозова, Т.А.* Не на пользу книги читать, коль только вершки в них хватать / Т.А.Полозова, Т.Д.Полозова. – М.: Просвещение, 1990. – С. 177–242.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ